Корш-Саблін, М.Садковіч), муз.-біягр. фільма і фільма-партрэта: «Партытура жыцця» (пра Я.Цікоцкага, 1968, рэж. П.Аліфярэнка), «Кампазітар Яўген Глебаў» (1978, рэж. С.Лук'янчыкаў), «Успаміны пра Мікалая Равенскага» (1993), «На кожны гук ёсць рэха на зямлі» (пра У.Перліна, 1995; рэж: абодвух М.Жданоўскі), «Душа мая, Элізіум ценяў» (пра А.Багатырова, 1998, рэж. С.Галавецкі), «На шляху да танцуючай зоркі» (пра Г.Праваторава, 1998, рэж. М.Князеў) і інш. Асаблівае месца займаюць этнамуз.-фільмы сцэнарыста-этнамузыколага З.Мажэйка: «Пранясі, божа, хмару» (1990, рэж.-аператар А.Шклярэўскі), «Рух зямлі» (1999, рэж. Ю.Лысятаў, С.Гайдук, аператар М.Сідорчанка) і інш.

*Літ.*: К у д и н о в а Т. От водевиля до мюзикла. М., 1982; Х а н и ш М. О песнях под дождем: Пер. с нем. М., 1984; Ш и л о в а И.М. Музыкальный фильм. М., 1984.

*А.А.Карпілава.*

**МУЗЫ́ЧНЫХ ІНСТРУМЕ́НТАЎ ВЫТВО́РЧАСЦЬ**, галіна мясцовай прам-сці Беларусі па выпуску муз. інструментаў і дэталей да іх. Муз. інструменты з даўніх часоў выраблялі майстры-умельцы. У 1920—30-я г. наладжана іх прамысл. вытв-сць. У 1999 дзейнічаюць прадпрыемствы, якія ўваходзяць у *Беларускае вытворчае аб'яднанне музычных інструментаў*, у т.л. *Барысаўская фабрыка піяніна* (галаўное прадпрыемства аб'яднання), Бобрскі з-д муз. дэталей (Крупскі р-н), а таксама *Маладзечанская фабрыка музычных інструментаў*. Асн. прадукцыя: піяніна, цымбалы, баяны, акардэоны, гармонікі, акустычныя гітары і электрагітары, дзіцячыя муз. цацкі. Вырабляюцца таксама індывід. муз. інструменты, у асноўным скрыпічныя. Найб. вядомыя муз. інструменты, створаныя бел. майстрамі: В.В.Богданам з Вілейскага, Б.П.Круглым з Лідскага, І.М.Карнеем з Смаргонскага, М.М.Міронам з Дзяржынскага р-наў, У.А.Крайко з Мінска, М.П.Такушэвічам з г. Маладзечна і інш.

**МУЗЫ́ЧНЫЯ ВУЧЫ́ЛІШЧЫ** Б е л а р у с і, сярэднія муз. навуч. установы ў сістэме *музычнай адукацыі*. Рыхтуюць музыкантаў-прафесіяналаў сярэдняй кваліфікацыі (інструменталістаў, спевакоў, хар. дырыжораў, тэарэтыкаў) для работы ў аркестрах, харах і выкладання ў муз. і агульнаадук. школах. Прымаюцца асобы пасля заканчэння музычнай і 8—10 класаў сярэдняй школ. Тэрмін навучання 4 гады.

У 19 ст. існавалі *Мінскае вучылішча арганістаў* і *Мінскае музычнае вучылішча* Н.Рубінштэйна пры *Мінскім таварыстве сяброў музыкі*. У 20 ст. адкрыты М.в. (да 1939 наз. муз. тэхнікумы) у Віцебску (1918), *Мінскае музычнае вучылішча* імя М.І.Глінкі, *Магілёўскае музычнае вучылішча* імя М.А.Рымскага-Корсакава, у Гомелі (1932), Брэсце (1939), якія адыгралі значную ролю ў фарміраванні нац. муз. кадраў, стварэнні творчых калектываў, развіцці бел. муз. культуры. У 1990-я г. зменены назвы (муз. каледж, каледж мастацтваў), формы і змест навучання некат. М.в.

У 1999/2000 навуч. г. працуюць: Баранавіцкае, Віцебскае, Гродзенскае, Лідскае, Магілёўскае, Мазырскае, *Маладзечанскае музычнае вучылішча* імя М.К.Агінскага, Мінскае, Наваполацкае М.в., Брэсцкі муз. каледж і Гомельскі каледж мастацтваў, якія маюць аддзяленні фп., струнных, духавых і ўдарных, нар. інструментаў, сольных і нар.-хар. спеваў, хар. дырыжыравання, тэорыі і гісторыі музыкі, артыстаў эстрады і цырка (Мінскае) і інш. Сярэднюю спец. муз. адукацыю даюць таксама муз. аддзяленні Мінскага, Пінскага, Гродзенскага, Віцебскага вучылішчаў мастацтваў.

*В.П.Пракапцова.*

**МУЗЫ́ЧНЫЯ ІНСТРУМЕ́НТЫ**, прылады, з дапамогай якіх здабываюцца акрэсленыя (або недакладна акрэсленыя) па вышыні і рытмічна арганізаваныя (або неарганізаваныя) гукі, паслядоўнасці гукаў, а таксама шумы. Абавязковыя элементы М.і. — вібратар, ці крыніца гуку (струна, мембрана, слуп паветра), і генератар, што пабуджае вібратар да вагання (смычок, сістэма малаточкаў і інш.). Многія М.і. маюць і амплiфікатар для ўзмацнення ваганняў (рэзанансавыя корпус, дошка) з мэтай атрымання гукаў большай сілы. Кожнаму М.і. уласцівы пэўны гукавы дыяпазон, комплекс тэмбрава-рэгістравых, дынамічных, выразных і тэхніка-выканальніцкіх магчымасцей. Якасць гучання залежыць ад матэрыялаў, з якіх яны зроблены, і нададзенай ім формы, можа мяняцца пры дапамозе дадатковых прыстасаванняў (напр., сурдзіны) і розных прыёмаў гуказдабывання.



Да арт. **Музычных інструментаў вытворчасць**. Участак зборкі электрагітар на Беларускім вытворчым аб'яднанні музычных інструментаў у г. Барысаў.



Да арт. **Музычных інструментаў вытворчасць**. Гатовая прадукцыя Маладзечанскай фабрыкі музычных інструментаў.

М.і. выконваюць разнастайныя грамадскія (ад прыкладной да ўласна эстэтычнай) і маст. функцыі (М.і. сольныя і ансамблевыя, меладычныя і рытмічныя і інш.). Падзяляюцца на нар. і прафесійныя. Іх развіццё непасрэдна звязана з развіццём грамадства, яго культуры, муз. мастацтва, выканальніцтва і тэхнікі вырабу. Паводле прынятай у сучасным *інструментазнаўстве* класіфікацыі Э.М. фон Хорнбастэля — К.Закса (прапанавана ў 1914), якая ўлічвае 2 вызначальныя прыметы — крыніцу гуку і спосаб яго здабывання, М.і. ўтвараюць 4 групы: ідыяфоны (самагучальныя), мембранафоны (мембранавыя), аэрафоны (духавыя) і хардафоны (струнныя); у 20 ст. і электрафоны (*электрамузычныя інструменты*). Крыніца гуку ў ідыяфонах — матэрыял, з якога зроблены інструмент або яго гучальная дэталь, у мембранафонах — нацягнутая перапонка (найчасцей са скуры жывёлы), у аэрафонах — заключаны ў трубцы слуп паветра, у хардафонах — нацягнутая струна. Залежна ад спосабу гуказдабывання ідыяфоны бываюць ударныя, саўдаральныя, патрэсвальныя, скрабковыя, шчыпковыя, аэрафоны — свабодныя, флейтавыя, язычковыя, амбушурныя; хардафоны — шчыпковыя, смычковыя, ударныя і фрыкцыйныя. Улічваюць і канструкцыйныя асаблівасці (вядомы флейты адзіночныя падоўжныя — адкрытыя і закрытыя, парныя).

Нар. М.і. беларусаў вызначаюцца разнастайнасцю тыпаў і іх лакальных разнавіднасцей. Група ідыяфонаў уключае *талеркі*, лыжкі, *вугольнік*, трашчотку, калотку, *брусочкі*, *звон*, *бразготкі*, званок, *шархуны*, кляшчоткі, драбінку, шмыгала, рагульку; у мінулым былі яшчэ *варган* і *біла* (калатушка); група мембранафонаў — *бубен*, *барабан* і грэбень (мірлітон); група аэрафонаў: свабодныя аэрафоны — лісты дрэў і травы, карынка, берасцянка, пуга, дудка шчылінная, *гармонік* і яго разнавіднасці — *баян* і *акардэон*; флейтавыя — *свісцёлка*, *акарына*, *дудка*, салавейка, парныя дудкі (раней, верагодна, і шматствольныя); язычковыя — *жалейка*, *кларнет*, дуда, *дудачка з падвойным язычком*; *амбушурныя* — *рог* і *труба*; група хардафонаў: смыкавыя — *скрыпка*, *басэтля*, *ліра* колавая, шчыпковабрынкальныя — *балалайка*, *мандаліна*, *гітара*, раней і *цытра*; ударныя — *цымбалы*. Паводле спосабу вырабу бел. нар. М.і. падзяляюцца на спецыяльна вырабленыя і прыстасаваныя для гукаўтварэння прадметы навакольнай прыроды і побыту. Вырабляюць М.і. музыканты-выканаўцы і муз. майстры-прафесіяналы. У 2-й пал. 20 ст. ў нар. муз. побыце ўсё часцей выкарыстоўваюць інструменты фабрычнай вытв-сці (скрыпка, цымбалы, гармонік, баян,